2 У Мастах КДБ затрымаў афіцэра міліцыі

5 Когда бывает больно...

7 Атлет з Глоўсевіч выступіць у Сіднеі



Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

№28 (161). 6 — 12 ліпеня 2000г. Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 85 руб.

ЯШЧЭ АДНО СВЯТА АДСВЯТКАВАЛІ

У мінулую нядзелю ў Слоніме гарадскія ўлады ладзілі свята з нагоды Дня Рэспублікі.





У сувязі з гэтым у цэнтры Слоніма прайшоў урачысты мітынг. Праўда, на ім у асноўным прысутнічалі начальства і пенсіянеры. Калі б не вайскоўцы і іх слаўны аркестр духавых інструментаў, то гэта частка мерапрыемства прайшла б даволі сумна.

Потым народ пацягнуўся ў гарадскі парк адпачынку, дзе піў піва і слухаў мясцовых артыстаў мастацкай самадзейнасці. Публікі там таксама было не багата, бо большасць людзей скарыстала вольны час з карысцю: актыўна працавалі на дзялках і дачах.


Фота Віталя ГІЛЯ

АДНАГО ЗДАРЭННЯ МАЛА ...

Гэты здымак карэспандэнт "ГС" зрабіў некалькі дзён таму ў Слоніме. Як бачыце, дзеці па-ранейшаму не пакідаюць месца сваіх гульняў — чатырохпавярховы даўгабуд, які знаходзіцца на Брэсцкай вуліцы.

"Газета Слонімская" ужо пісала (№25, ад 15-21 чэрвеня 2000 г.), што тры тыдні назад з 10-метровай вышыні гэтага будынка ўпаў 14-гадовы хлопчык, які з цяжкімі калецтвамі патрапіў у бальніцу. Толькі дзякуючы намаганням дактароў, ён застаўся жыць. Але, як сведчыць фотаздымак, аднаго здарэння для мясцовых уладаў мала. Гэты небяспечны помнік архітэктуры сучаснасці так і застаецца даступным для ўсіх.

Анатоль МІРСКІ



Фота Віталя ГІЛЯ

НАША ЭКОНОМИКА

АГРАРНЫЙ КРИЗИС ВНОВЬ НАПОМИНАЕТ О СЕБЕ

Со времени прихода к власти А.Лукашенко аграрный кризис в Республике Беларусь носит перманентный характер. И все это время от кампании к кампании власти безуспешно пытаются решить аграрные проблемы. В последний период в центре внимания находятся проблемы подготовки к уборке урожая и заготовки кормов. Термин "битва за урожай" как-то исчез из лексикона руководителей республики. Видимо, потому, что "битв" было много, но не было побед.

Чтобы улучшить ситуацию с подготовкой к уборке урожая и интенсифицировать заготовку кормов, А.Лукашенко в середине июня провел специальное совещание чиновников рангом от губернатора и выше. А ситуация действительно тревожная. На каждый из комбайнов приходится 185 гектаров зерновых, не считая зернового поля частного сектора. Но и эти комбайны почти наполовину неисправные. По состоянию на конец второй декады июня, когда до начала уборки оставалось менее трех недель, было отремонтировано только 55 процентов уборочных агрегатов, а в Витебской и Могилевской областях, по сообщению Министерства сельского хозяйства и продовольствия, меньше половины. Отставание с подготовкой уборочной техники связано с огромными трудностями в финансовой сфере. Нет денег на запчасти, на горючее, и не удается преодолеть невиданную задолженность по заработной плате. На начало июня задолженность работникам колхозов и совхозов превысила 10 млрд. рублей. В этих условиях подготовка к жатве идет без особого энтузиазма.

(Продолжение на 3 стр.)

Власти дали добро

Горисполком Гродно дал разрешение на строительство в городе культурно-просветительного центра Союза поляков на Беларуси.

Центр будет возведен рядом с Домом поляков, на месте одноэтажного деревянного здания, где живут две семьи, которые получат другие квартиры. Средства на эти цели и строительство центра выделяются Республикой Польша. В новом здании планируется разместить, в частности, киноконцертный зал, библиотеку польской книги, классы для изучения польского языка, зал для репетиций коллективов художественной самодеятельности.

Начало строительства намечено на лето 2001 года.

Ася КУНИЦКАЯ

Гарадскія аўтобусы будуць хадзіць радзей

У сувязі са складаным фінансавым становішчам, дырэкцыя аўтобуснага парка №3 г.Слоніма прыняла рашэнне скараціць колькасць рэйсаў на гарадскіх аўтобусных маршрутах у вячэрні і дзённы час.

Цяпер на адзін аўтобус паменее на маршруце №12, на два – на маршруце №6, на адзін – на маршруце №2, а таксама здымаецца аўтобус №11 па суботах.

Б.П.

ВЯЛІКІ ДЗЯКУЙ ВАМ ЗА ТОЕ, ШТО ВЫ ЁСЦЬ!



Шаноўныя сябры, як мы ўжо адзначалі, з другога паўгоддзя 2000 г. "Газету Слонімскую" можна выпісаць у любым рэгіёне Беларусі. Такім чынам мы выканалі пажаданні нашых землякоў, якія жывуць па-за межамі Слонімшчыны і хочуць ведаць, што адбываецца на радзіме. Зразумела, яшчэ не ўсе нашы патэнцыяльныя чытачы ведаюць пра такую магчымасць і таму не скарысталі яе, каб стаць пастаяннымі сябрамі газеты. Тым не менш, як сведчаць вынікі падпіскі, цяпер нас таксама будуць чытаць у Мінску, Гомелі, Пінску, Міёрах. А ўвогуле трэба сказаць, што тыраж па падпісцы нашай газеты значна вырас і склаў 4270 экз. Агульны наклад "ГС" – 8900 экз.

Дзякуй сябры, што вы выбралі нас!

Рэдакцыя

Была пагроза выбуху

На мінулым тыдні, 28 чэрвеня, працоўныя кааператыва "Зодчий" падчас земляных работ адкапалі 30-мм баявы асколачна-фугасны снарад.

Яны аператыўна вызвалі сапёраў, якія адвезлі "знаходку" на размініраванне. Адзначым, што гэта быў снарад, падобны на той, ад якога ў ліпені 1999 года на Абуз-Лясноўскім палігоне атрымалі раненні васемнаццаць вайскоўцаў Слонімскай 11-й механізаванай брыгады.

Вольга ШЫНКЕВІЧ

Новая экспазіцыя

У Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музеі (Мастоўскі раён) адкрылася філатэлістычная выстава "Спадчына".

Экспанаты для яе прадставіў жыхар Ваўкавыска Мікалай Бухаўцаў. Экспазіцыю складаюць канверты, маркі Беларусі, Польшчы, Літвы. У іх адлюстраваны асноўныя перыяды беларускай дзяржаўнасці ад Рагвалода да сучаснасці.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ТРИБУНА

"Где вы собираетесь провести СВОЙ ОТПУСК?"

С таким вопросом корреспонденты "ГС" обратились к слонимчанам.



Валерий Шикуть, *военный пенсионер:*
— В огороде. Отпуск вообще-то уже заканчивается... Я никуда не поехал и не поеду, буду работать.



Татьяна Надудик, *парикмахер:*
— Я выхожу замуж этим летом, поэтому с мужем уезжаем в свадебное путешествие на море, в Гагры.



Валерий Козелецкий:
— Летом я буду работать на стройке, потом поеду на море.



Ольга Антонова, *студентка Слонимского медучилища:*
— Я еду отдыхать в Тульскую область России, на родину моего отца. Я студентка последнего курса медучилища, поэтому му потом уезжаю работать. Свои последние месяцы перед работой хочется провести подальше отсюда, чтобы уйти от всех житейских забот.



Денис Доронин:
— На летние месяцы я уезжаю в Москву, на мою историческую родину. Потом хочу совершить паломничество в Троице-Сергиеву лавру.

Вячеслав:
— Конечно, в Слониме. Буду пить пиво с друзьями, поеду на шашлыки.


Семья Шевелевых:



— Дома, в деревне. Будем совмещать работу с отдыхом.



Оксана Руцкая:
— Я нахожусь в отпуске по уходу за ребенком. Поэтому все свое время собираюсь посвятить ребенку. Потом, может, поеду на дачу.



Ирина Белановская:
— Буду проводить свой отпуск в Слониме. Надеюсь, будет хорошая погода, отдохну на озере, побуду в компании с друзьями, приготовим шашлыки.



Алексей Скок:
— Я ещё не решил, возможно, устроюсь на работу.



Михаил Новиков:
— У меня нет отпуска, я живу в деревне. Мы отдыхаем только зимой.



Александр и Зарина:



— Я летом ухожу служить в армию.
— А я летом буду работать на рынке. Отдыхать некогда.

Также наши корреспонденты с этим вопросом обратились и к некоторым руководителям предприятий Слонима.

Михаил Соловей, *директор нефтебазы:*
— Я, наверное, поеду в какой-нибудь белорусский санаторий, например, в "Поречье" или "Энергетик".

Леонид Шкляр, *директор картонно-бумажного завода:*
— Я проведу свой отпуск на южном берегу реки Иссы и на даче в Якимовичах.

Юрий Бессонов, *директор управления магистральных газопроводов:*
— Собираюсь съездить с семьей на родину в Севастополь.

По словам сотрудницы бюро путешествий и экскурсий Елены Кидало, слонимчане предпочитают выезжать на Украину, в Николаевскую область, Крым, Евпаторию, так как цены в эти места отдыха значительно ниже, в отличие от других курортов. В среднем отдых на Украине обойдется слонимчанам от 70 до 200 у.е., включая проживание, питание и проезд. Если кто-нибудь захочет провести своё свободное время на территории родной Беларуси, например, на Нарочи или на Браславских озёрах, то такое удовольствие обойдется от 68 до 81 тыс. белорусских рублей за 12 дней. Любителям отдохнуть за границей предлагается посетить Болгарию (от 115 у.е. + 67 тыс. рублей + транзитная виза по Румынии, без питания), Италию, Испанию (от 305 у.е. + 30 тыс. рублей + 34 тыс. рублей за визу), Кипр, Египет (от 462 у.е. + 24 тыс. рублей), Турцию (от 250 у.е. + 50 тыс. рублей), Чехию (от 260 у.е. + виза). Для детей предусматриваются скидки.

Ольга ШИНКЕВИЧ, Виталий ГИЛЬ (фото)

ДЭМАКРАТЫ БЕЛАРУСІ ВЫКАЗАЛІ СВАЕ ПАТРАБАВАННІ

Кангрэс дэмакратычных сіл (КДС) Беларусі патрабаваў правядзенне рэальных перамоў паміж уладай і апазіцыяй і выкананне ўладамі ўмоў для правядзення свабодных і справядлівых выбараў. Гэтыя ўмовы былі сфармуляваны Санкт-Пецярбургскай дэкларацыяй Парламенцкай Асамблеі АБСЕ і ў выніковым дакуменце Стамбульскага саміта АБСЕ.

Пра гэта ідзе размова ў рэзалюцыі КДС, прынятай 2 ліпеня ў Мінску па выніках дэмакратычнага форуму.

У рэзалюцыі, у прыватнасці, адзначаецца, што правядзенне свабодных выбараў з'яўляецца адзінай магчымасцю для пераадолення канстытуцыйнага і эканамічнага крызісу і для дэмакратызацыі беларускага грамадства. Аднак, як адзначаецца ў дакуменце, у тых умовах, што склаліся ў Беларусі, "усякія выбары ператвараюцца ў фарс, удзел у якім для дэмакратычных сіл немагчымы". Беларуская апазіцыя, па-ранейшаму, у якасці ўмоваў свайго удзелу ў выбарах вылучае чатыры патрабаванні:

- перадача парламенту рэальных паўнамоцтваў як адзінаму заканадаўчаму органу;
- прывядзенне выбарчага заканадаўства ў адпаведнасць з еўрапейскімі стандартамі;
- забеспячэнне рэальнага доступу апазіцыі да сродкаў масавай інфармацыі;
- спыненне палітычных рэпрэсій і забеспячэнне свабоды мірных сходаў і свабоды слова.

Толькі пасля выканання пералічаных патрабаванняў дэмакратычныя сілы Беларусі змогуць прыняць удзел у парламенцкіх выбарах. Прычым, у адпаведнасці з рэзалюцыяй, яны павінны быць выкананы не пазней, чым за чатыры месяцы да прызначаных выбараў.

Кангрэс таксама раіць партыям, якія ўваходзяць у Каардынацыйную раду дэмакратычных сіл, забараніць удзельнічаць сваім сябрам у парламенцкіх выбарах у выпадку невыканання чатырох патрабаванняў. Акрамя гэтага, у рэзалюцыі ўтрымліваецца заклік да міжнародных арганізацый не накіроўваць сваіх наглядальнікаў на парламенцкія выбары ў выпадку невыканання ўладамі патрабаванняў апазіцыі.

Напярэдадні працы Кангрэса карэспандэнт "ГС" узяў інтэрв'ю ў лідэраў дэмакратычнага руху на Беларусі.

Анатоль Лябедзька — старшыня АГП:
— На маю думку, IV Кангрэс дэмакратычных сіл павінен стаць кропкай адліку пашырэння дэмакратычнай кааліцыі. А па прынцыпу Каардынацыйнага савета дэмакратычных сіл павінна адбыцца стварэнне дэмакратычнай вертыкалі: абласных і раённых каардынацыйных радаў. Урэшце мы павінны вызначыцца з адзіным кандыдатам ад апазіцыі на прэзідэнцкіх выбарах, якія павінны адбыцца ў наступным годзе.

Станіслаў Шушкевіч — старшыня БСДГ:
— На гэтым Кангрэсе мы абавязаны вызначыцца наконт удзелу ў выбарах у парламент. Сёння палата прадстаўнікоў не мае ніякіх паўнамоцтваў. Указы і дэкрэты прэзідэнта пераважваюць над усімі законамі. І хто б там не казаў, што наш няўдзел у выбарчай кампаніі — гэта наша баязлівасць і слабасць, я ўпэўнены, што няўдзел наш у выбарах — гэта наша сіла.

Мікалай Статкевіч — старшыня БСДП:
— Спадзяюся, што Кангрэс дэмакратычных сіл дакажа нашаму грамадству еднасць апазіцыі, а ў еднасці — яе сіла. Што тычыцца нашай пазіцыі наконт удзелу ці няўдзелу ў выбарах у палату прадстаўнікоў, то на сённяшні дзень выбарчае заканадаўства не прыведзена да еўрапейскіх стандартаў. Калі ўлады выканаюць умовы для правядзення свабодных і справядлівых выбараў, то мы тады перагледзім свае пазіцыі. У гэтым пытанні мы не павінны першымі зачыняць дзверы.

Вінцук Вячорка — старшыня рады БНФ:
— Кангрэс аб'яднаў усе партыі, рухі, грамадскія арганізацыі. У адзінстве дзеянняў усіх дэмакратычных сіл — вялікі грамадскі набытак, найважнейшая ўмова перамогі над дыктатурай. Асновай адзінства з'яўляецца прызнанне законна абранага Вярхоўнага Савета XIII склікання адзіным легітымным органам заканадаўчай улады.

Алег Трусаў — старшыня ТБМ:
— Як Кангрэс дэманструе еднасць апазіцыі, так і наша мова павінна выступаць гарантам самастойнасці і незалежнасці нашай беларускай дзяржавы.

Юрый ПАЦЁМКІН, Язэп ПАЛУБЯТКА

НАЧАЛЬНІКА АДДЗЕЛА МАСТОЎСКАЙ МІЛІЦЫІ ЗАТРЫМАЛІ ЗА ХАБАР

Нядаўна супрацоўнікі КДБ па Гродзенскай вобласці арыштавалі начальніка аддзела па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю мастоўскай міліцыі Аляксандра Хадаску.

Затрыманне адбылося ў будынку райаддзела ўнутранных спраў, проста на працоўным месцы. Раніцай, у пачатку дзесятай гадзіны, калі супрацоўнікі аддзела сабраліся ў актавай зале на занятку, двое мужчынаў у цывільным у імгненне вока перасеклі двор перад міліцыяй ды пераскочылі цераз уваходны бар'ер. Дзяжурны нарад не паспеў іх затрымаць і вымушаны быў аб'явіць трывогу: "Напад на міліцыю!". Неўзабаве з'явілася яшчэ сем супрацоўнікаў камітэта. Маёра Хадаску выклікалі з занятку, і ў яго кабінеце быў праведзены вобыск, падчас якога, згодна слоў аднаго з супрацоўнікаў міліцыі, які прасіў не называць яго прозвішча, былі знойдзены "мечаныя" даляры, якія начальнік Мастоўскага АБЭЗ атрымаў у якасці хабару. Тут жа Аляксандр Хадаска быў арыштаваны і змешчаны ў гродзенскі следчы ізалятар. Згодна слоў таго ж супрацоўніка міліцыі, адносна Аляксандра Хадаскі можа быць узбуджана крымінальная справа па артыкуле 169 частка 2 Крымінальнага кодэксу (атрыманне хабару шляхамі вымагальніцтва). Пракаменціраваць факт затрымання кіраўніцтва мастоўскай міліцыі адмовілася.

Як стала вядома карэспандэнту "ГС", праз тры дні затрыманага выпусцілі пад падпіску аб нявыездзе. За гэты час Аляксандр Хадаска быў звольнены з органаў унутранных спраў. Дарэчы, у гэты дзень за атрыманне хабару быў затрыманы і супрацоўнік Іўеўскай міліцыі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны: рэдакцыі ....2-14-39 ....(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

Падпісана да друку 5 ліпеня 2000г. Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Слонімскай узбуйненай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы: 64042 (індывідуальная) 63818 (ведамасная)
Наклад 8900 экз.
Заказ №2369

НАВІНЫ

Падарунак акадэміка

Акадэмік Радзім Гарэцкі падараваў Гудзевіцкаму музею літаратурна-краязнаўчаму музею калекцыю карысных выкапняў Беларусі.

Яна налічвае болей як дзве сотні экспанатаў, якія сведчаць аб багацці нетраў нашай краіны. Зараз у загадчыка музея Алеся Міхайлавіча Белакоза з'явіліся прыемныя клопаты па стварэнню адпаведнай экспазіцыі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Пракуратура наводзіць парадак

Мастоўская пракуратура пазбаўляе ільготнага крэдытавання тых, хто не мае на гэта права.

Па прадстаўленню пракурора, мясцовы райвыканкам вырашыў выключыць са спісаў на ільготнае крэдытаванне пяць чалавек, у тым ліку 4 наогул выключаны са спісаў членаў жыллёва-будаўнічага кааператыва. Прычына адна: выяўлены грубыя парушэнні жыллёвага заканадаўства.

Антон МАКЕЙ

Узнік "Сямейны ачаг"

Мінюст Беларусі зарэгістраваў дабрачыннае таварыства "Сямейны ачаг".

Гэта арганізацыя пачала дзейнічаць у Мастах і мае на мэце дапамагаць шматдзетным, няпоўным сем'ям, а таксама ўсім дзецям, якім неабходна дапамога, і якія засталіся па-за ўвагай дзяржавы. Узначальвае таварыства Галіна Міхальчук.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Вучыцца слонімская моладзь

Саюз маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў "Беларуская Нацыянальная маладзёжная рада" у Гродне правёў семінар на тэму "Асновы ўзаемадзеяння дзіцячых ініцыятыў з грамадскасцю".

На семінар з'ехаліся 32 чалавекі з Гродзенскай вобласці. Яны пазнаёміліся з дзейнасцю дзіцячых ініцыятыў рэгіёна, атрымалі веды аб падставах эфектыўнай камунікацыі, даведаліся аб эфектыўным выкарыстанні буклетаў, брашур, бюлетэняў і г. д.

Слонімшчыну на семінары прадстаўлялі Алег Шэлестаў і Арцём Наумец з творчага маладзёжнага аб'яднання "Вятрак", якое дзейнічае ў вёсцы Мірная, і Усевалад Сяўлюк з арганізацыі "Ветразь".

Сяргей ЧЫГРЫН

Преостановили начисление пени


Вступил в силу указ белорусского президента № 364 "О неотложных мерах по оздоровлению финансового состояния юридических лиц и индивидуальных предпринимателей".

В соответствии с ним приостанавливается начисление пени "за несвоевременно внесенные юридическими лицами и индивидуальными предпринимателями платежи в бюджет, в том числе в целевые бюджетные фонды, по состоянию на 1 июля 2000 года".

Олег СОКОЛОВ

НАША ЭКОНОМИКА

АГРАРНЫЙ КРИЗИС ВНОВЬ НАПОМИНАЕТ О СЕБЕ


Фото IREX/ProMedia

(Начало на 1 стр.)

Энтузиазма не прибавляет и то обстоятельство, что посевы зерновых находятся в незавидном состоянии. Сказываются не только климатические условия, но и качество обработки почвы, неполная заправленность органическими и минеральными удобрениями, далеко не лучшие сроки посева. Поэтому, по оценке специалистов, в нынешнем году сбор зерна будет примерно на 30 процентов меньше, чем в прошлом году. Следовательно, где-то в пределах трех миллионов тонн. Не случайно при недавнем посещении Минского моторного завода на вопрос рабочего, почему хлеб стал таким дорогим, Александр Лукашенко ответил: "Беларусь зерно не выращивает. Она его покупает. Поэтому буханка черного хлеба и стоит 300 рублей. Да государство дает дотацию на эту буханку 200 рублей". Такое заявление, конечно, звучит тревожно, и оно свидетельствует о том, что цены на хлеб будут расти и впредь. Но на каком основании руководитель государства пришел к выводу, что Беларусь не выращивает зерно? Видимо, созданы такие условия, что она не может выращивать хлеб. Но это дело другое. Лучше бы А.Лукашенко пояснил, почему наши соседи, например Литва, Латвия и Польша, обеспечивают рост сборов зерна, а у нас урожайность зерновых из года в год падает.

Власти предвидят, что зерно придется закупать и в этом году. И не только продовольственное, но и фуражное. Поэтому уже сегодня предпринимаются меры, чтобы его приобрести. С этой целью Беларусь рядится в тогу богатого компаньона интеграционного процесса. Только что приобретенные в Польше комбайны, еще не прошедшие рабочей обкатки, грузятся на железнодорожные платформы и вместе с комбайнерами направляются в Краснодарский край убирать российскую пшеницу. Планируется заработать на каждом комбайне 160 тонн твердой пшеницы. А всего где-то около 6 тыс. тонн. Но ведь произойдет износ новой техники, плюс необходимо считать затраты на перевозку. Не получится ли так, что игра не стоит свеч?

Параллельно с кризисом зернового хозяйства углубляется кризис в животноводстве. На 10 процентов сократилось поголовье крупного рогатого скота. Это привело к резкому сокращению производства молока и мяса. А.Лукашенко на аграрном совещании потребовал, чтобы поголовье было восстановлено к 1 октября. С этой задачей можно справиться, если выделить большие средства для закупки молодняка в личных подсобных хозяйствах. Но таких денег нет. И хозяйства находят выход в том, что обещают рассчитаться за молодняк натурой: грубыми кормами и зерном. Но это подрывает кормовую базу общественного животноводства.

Есть еще более серьезная угроза сокращения продуктивности общественного животноводства. Речь идет о неудовлетворительном ходе заготовки травянистых кормов. Власти поставили задачу обеспечить в этом году прирост заготовки всех видов кормов в сравнении с прошлым годом на 40 процентов. Однако это задание не выполняется. По данным начальника отдела кормопроизводства Министерства сельского хозяйства и продовольствия Марии Парфеновин, продуктивность одного гектара трав первого укоса составляет всего 12–14 процентов кормовых единиц.

Где же выход из сложившейся ситуации? Власти видят его прежде всего в том, чтобы после первого укоса провести подкормку трав из расчета 45–60 кг действующего азота на гектар. Но, во-первых, это очень трудоемкая и дорогостоящая работа. Во-вторых, будет ли соответствующая погода для уборки трав второго укоса? Столь же проблематично и решение использовать пожнивные посевы для пополнения запасов кормов. В прошлом году также была надежда на пожнивные посевы. Чем все закончилось — известно. Бескормица унесла сотни тысяч голов скота. Мало надежд и на административное решение кормовой проблемы. Жителям районных центров — учителям, служащим, рабочим — доводятся жесткие задания по заготовке грубых кормов: по 300 кг сена на человека. Надо сказать, что это серьезное задание, тем более что надо иметь навыки косьбы, инвентарь и время, а также транспорт для поездки к месту сеноуборки. Конечно, определенное количество кормов для общественного скота будет заготовлено и таким способом. Но сказать, чтобы это было определяющей мерой решения кормовой проблемы, очень трудно. Тем более, что эта мобилизационная мера не дала положительных результатов и в прошлом году.

Владимир КУЛАЖЕНКО, доктор экономических наук, профессор

ФОТАФАКТ



Для беларусаў надышла гарачая пара – нарыхтоўка ежы на зіму. Як вядома, летні дзень год корміць. Таму сёння многія слонімцы таксама стараюцца запасціся слоікамі (на здымку), каб нарабіць як мага больш розных марынадаў і засолаў на доўгую зіму. Бо сваё – яно смачнейшае і таннейшае.

Фота Віталя ГІЛЯ

ЗДАРЭННІ

Укралі кабель сувязі

Раніцай 18 чэрвеня на чыгуначным перагоне Слонім – Азярніца двое слонімцаў выразалі 25 метраў кабелю сувязі на агульную суму звыш 33 тысяч рублёў.

Рамонтныя работы па аднаўленню сувязі на чыгунцы выліліся ў суму 288 тысяч рублёў. Самі злодзеі затрыманы. Адзін з іх аказаўся работнікам чыгуначнага транспарту.

Па факту крадзяжу ўзбуджана крымінальная справа.

Дзмітрый ДРОЗД

Абакралі дзяцей

У дзіцячы аздараўленчы цэнтр "Баравічок", што ў Дзятлаўскім раёне, залез злодзей.

Ён украў рэчы дзяцей, якія там цяпер адпачываюць. Міліцыя шукае злодзея.

Крадуць бензін

У калгасе "Слава працы" Дзятлаўскага раёна нядаўна ўкралі 80 літраў бензіну.

Міліцыя хутка выйшла на след злачынцаў. Імі аказаліся двое мясцовых жахароў, якія раней таксама былі асуджаны за крадзёж.

Незадоўга да гэтага ў гаспадарцы было ўкрадзена 120 літраў бензіну.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Затрымалі "трактарыста"

Днямі слонімская міліцыя затрымала непрацуючага мясцовага жыхара.

Ён на працягу пэўнага часу вынес з маторарамонтнага завода запчастак да трактарных рухавікоў на агульную суму звыш 200 тысяч рублёў.

Па дадзенаму факту праводзіцца следства.

В.Я.

Трагедыя на вуліцы 7 лістапада

У Лідзе 6-гадовая дзяўчынка ўпала з балкона сваёй кватэры.

Застаўшыся без нагляду дарослых, яна выйшла на балкон і, аступіўшыся, паляцела ўніз. На працягу амаль 20 гадзін дактары змагаліся за яе жыццё, але выратаваць так і не змаглі.

Валянціна МАХНАЧ

Забраў усё сала

Нядаўна невядомы мужчына ноччу, разбіўшы шкло ў акне, трапіў у хату жыхаркі вёскі Мілявічы Мастоўскага раёна.

Пагражаючы нажом, ён забраў у жанчыны 23 тысячы рублёў і 10 кілаграмаў сала.

Праз пэўны час міліцыя нібы выявіла асобу злачынцы і цяпер намагаецца яго затрымаць.

Антон МАКЕЙ

Злавілі на гарачым

Днямі слонімская міліцыя затрымала жыхара Слонімскага раёна, у якога багажнік машыны быў цалкам забіты макавымі галоўкамі.

Па дадзенаму факту праводзіцца праверка, бо, як вядома, гэта зелле выкарыстоўваецца ў якасці наркотыка.

В.Я.

Скоро останемся и без белорусской водки

Ликероводочные заводы Беларуси сворачивают производство водки. Причина — высокий акциз, который составляет сегодня 6 евро за один литр безводного (стопроцентного) этилового спирта и делает выпуск водки убыточным.

Убытки на каждой бутылке достигают 200 рублей. Уже остановили производство гродненский и витебский ликероводочные заводы; брестский завод закрывается на капитальный ремонт.

За последние два месяца официальный курс евро к белорусскому рублю увеличился на 40 процентов, в то время как отпускная цена водки — всего на 5 (повышение произошло 23 июня). В результате один только акциз на бутылку водки вместимостью 0,5 литра составляет 738 рублей (по официальному курсу евро на 27 июня), в то время как ее отпускная цена — около 1.100 рублей. Руководители заводов считают необходимым снизить акциз хотя бы до 5 евро. Повышение цен на водку они считают нецелесообразным, поскольку их нынешний уровень уже привел к снижению объемов продаж.

Дмитрий ВЛАСОВ

Армия наркоманов растет

На Гродненщине растет преступность, связанная с незаконным оборотом наркотиков.

С начала года в области зарегистрировано 187 таких преступлений, конфисковано около 7 килограммов готовых наркотиков и 106 килограммов наркосодержащего сырья. Наибольшее распространение имеют маковая солома и конопля. И лишь около 10 процентов наркотиков — привозные, среди которых преобладают марихуана и гашиш. Реже, но встречаются синтетические — героин и кокаин.

Росту преступности способствует увеличение потребления зелья. На сегодняшний день в области официально зарегистрированы около 400 больных наркоманией. Согласно международной методике принято считать, что на одного явного наркомана приходится 5–10 скрытых. Поэтому, как полагают специалисты, официальная статистика наркомании в области далеко не в полной мере отражает масштаб проблемы.

Ася КУНИЦКАЯ

Налоги валютой

Отныне налогоплательщики Беларуси при недостаточности на текущих счетах средств в белорусских рублях и наличии иностранной валюты на валютных счетах должны в пятидневный срок производить ее продажу и обеспечивать уплату обязательных платежей в бюджет.

Такое решение принято Советом Министров страны в целях уменьшения задолженности организаций по платежам в бюджет, государственные целевые бюджетные и внебюджетные фонды.

По данным Государственного налогового комитета, на 1 июня этого года задолженность по доходам и поступлениям в бюджет составила 15,2 миллиарда рублей, в том числе задолженность по доходам - 8,8 миллиарда рублей, задолженность по целевым фондам — 6 миллиардов рублей.

Егор ЗВОННИКОВ

Будем жить с единым обменным курсом

Национальный банк Беларуси надеется, что в третьем квартале нынешнего года можно выйти на единый обменный курс белорусского рубля.

Как сообщили БелаПАН в Нацбанке, постоянный контроль за динамикой важнейших показателей позволил в январе-мае удерживать их на уровне, определенном основными направлениями денежно-кредитной политики и решениями правительства.

Особое внимание уделялось обеспечению положительного уровня процентных ставок, что способствовало нормализации денежно-кредитной сферы. Осуществлялся ряд мер, направленных на поддержание стабильности белорусского рубля на различных сегментах валютного рынка и сокращение разрыва котировок обменных курсов национальной валюты.

БелаПАН

МОЖЕМ ОСТАТЬСЯ БЕЗ МОСТОВ

На сегодняшний день из 4.700 мостов и путепроводов Беларуси более 2.000 (45 процентов) не соответствуют требуемым нормам.

В дорожной сети республиканского значения, по которой осуществляется порядка 80 процентов всех перевозок, несоответствие этим нормам составляет более 50 процентов, на местных дорогах — 40 процентов. Об этом БелаПАН сообщили в Комитете по автомобильным дорогам при Министерстве транспорта и коммуникаций Беларуси.

По мнению дорожников, одна из основных причин критического положения дел в белорусском мостовом хозяйстве — это многократно возросшие нагрузки. К ним мосты и путепроводы, спроектированные и построенные еще по "советским" нормативам, оказались не готовы. Ущерб, нанесенный в результате этого белорусским дорогам, по некоторым оценкам, составляет порядка 40 миллиардов белорусских рублей, что превышает половину объема средств республиканского дорожного фонда.

Еще одной серьезной проблемой является кадровая: не хватает грамотных специалистов-мостовиков с опытом работы для различных направлений — эксплуатации сооружений, диагностики, планирования, ремонта и надзора.

По оценкам специалистов, в сложившейся ситуации через 5-7 лет непригодными к эксплуатации могут оказаться все мосты и путепроводы республики. Дорожники надеются, что решению проблемы поможет готовящаяся к утверждению программа "Мосты XXI века" и создание отечественной системы управления состоянием мостов "Белмост".

Алексей ОРЕШКО

В МОСКВЕ БЕЛОРУССКИЙ ЛИДЕР МИЛОСТИВО СОГЛАСИЛСЯ "принять российский рубль"



Московский саммит лидеров СНГ 21 июня снова прошел под диктовку Москвы. Принятые решения отразили прежде всего стратегические интересы Кремля. Белорусский же руководитель, который накануне в очередной раз обещал поставить ребром вопрос о зоне свободной торговли, снова уехал несолоно хлебавши.

Зато перед отбытием, на встрече с Путиным, Лукашенко с апломбом заявил, что "мы готовы принять российский рубль". "Мы" — то есть Беларусь в качестве единого для союза двух стран расчетно-платежного средства. И каков, заметьте, оборот: готовы принять! Так сказать, снизошли. А то, можно подумать, кто-то всерьез обсуждал союзные перспективы "зайчика"...

Впрочем, Александру Григорьевичу не привыкать делать хорошую мину. Вспомним события месячной давности. В конце мая в Минск слетелись лидеры таможенной "пятерки". И накануне Лукашенко тоже всячески храбрился в том смысле, что уж в родных-то стенах, да заодно с коллегами-президентами, наверняка припрет к стенке несговорчивую Россию, которая всячески (ну невыгодно ей, элементарно невыгодно!) отбрыкивается от зоны свободной торговли. Это тогда белорусский лидер со зловещим пафосом изрек: "Если зона свободной торговли не будет создана, мы все будем наказаны развалом Содружества".

Но в итоге Путин в Минске жестко отстоял интересы своей страны и отодвинул вопрос о пресловутой зоне "на потом". Сейчас, на саммите в Москве, ситуация повторилась. С той лишь разницей, что российская сторона пообещала реализовать основные принципы зоны свободной торговли через год — к июлю 2001-го.

Во-первых, это долго. Во-вторых, нет никакой гарантии, что обещание будет выполнено (зато мучительная история СНГ наполнена примерами обратного рода). И наконец, что значит "реализовать основные принципы"? Тот же горький опыт подсказывает, что вместо полноценного решения проблемы подсунут паллиатив.

Зато по полной программе Москва выжала из лидеров СНГ поддержку своих геополитических амбиций.

Симптоматичен в этом отношении комментарий от 22 июня в респектабельных "Известиях". Говоря о борьбе с международным терроризмом, обозреватель газеты резюмирует, что "эта тема постепенно становится единственной реальной идеей, способной наполнить Содружество смыслом". В таких случаях говорят: приехали! В данном конкретном случае — к Содружеству, смысл которого, если без обиняков — война, пусть себе и под самыми благородными лозунгами.

Тем не менее, Кремль методично продавливает свои великодержавные интересы. Так, 21 июня в Москве утверждена рассчитанная на три года совместная программа борьбы с терроризмом. Создан антитеррористический центр Содружества во главе с российским генералом ФСБ. Да, понятно желание Москвы получить таким образом косвенную поддержку войны в Чечне, а также поставить заслон исламизму в центральноазиатском регионе. Естественно, в какой-то степени опасность международного терроризма существует и для Беларуси. Но, слава богу, она отнюдь не в числе главных. У Беларуси в контексте СНГ масса куда более животрепещущих проблем — в первую очередь экономических! Однако именно эти вопросы раз за разом откладываются "на потом".

Казалось бы, куда важнее сбалансировать по всем цивилизованным параметрам жизнь в своей стране. Но в том и беда, что белорусский режим, говоря языком наркозависимой публики, "капитально подсел на иглу". Российскую иглу. Ведь косвенные дотации режиму — за счет относительно низких цен на энергоносители и ряда других поблажек — составляют, по прикидкам специалистов, от полутора до двух миллиардов долларов в год. Своими силами нынешняя белорусская власть решить запущенные экономические проблемы не в состоянии.

Вот и приходится бежать на привязи за великодержавной колесницей.

А также милостиво соглашаться "принять российский рубль".

Последнее, кстати, опаснее всего. Это уже не та пустая интеграционная риторика, которой сопровождалось регулярное целование Лукашенко с Ельциным. Единая валюта являет собой, по дружному мнению неангажированных экспертов, приговор белорусскому суверенитету.

Александр КЛАСКОВСКИЙ

Тарифы на месте не стоят

В июне нынешнего года в Беларуси выросли тарифы практически на все виды коммунальных услуг.

По сравнению с маем на треть увеличились тарифы на газ, вывоз и обезвреживание отходов, на 6 процентов — тарифы на холодную воду и канализацию, а также плата за пользование лифтом, на 20 процентов — плата за пользование радиоточкой, и на 3 процента — плата за горячую воду.

Стоимость одной гигакалории тепловой энергии, идущей на подогрев воды, увеличилась с 448 до 461 рубля, плата за пользование лифтом — с 40 до 42,36 рубля на человека, радиоточкой — с 66 до 79 рублей за единицу.

Кроме того, как уже сообщал БелаПАН, на 30 процентов увеличилась ставка квартплаты (с 3,74 до 4,86 рубля за квадратный метр общей площади). Необходимо отметить, что с июня началось взимание квартплаты по себестоимости за "излишки" общей площади (в среднем по 47 рублей за квадратный метр). По обычному тарифу взимается плата из расчета 20 квадратных метров общей площади на человека плюс 10 квадратных метров на семью.

Дмитрий ВЛАСОВ

Гродно на одной дискете

Создана мультимедийная энциклопедия Гродно. Ее автор — одиннадцатиклассник средней школы № 13 областного центра Алéксандр Волкович.

Он собрал и систематизировал сведения о важнейших событиях современной жизни и историческом прошлом города. Текстовая информация снабжена видеорядом. Достаточно выбрать место на карте Гродно, чтобы после нажатия клавиши получить на мониторе компьютера видеоизображение и соответствующую информацию. Компьютерная энциклопедия уместилась на одной дискете. С ее помощью можно получить сведения об истории города над Неманом, памятных местах, выдающихся личностях, имена которых неразрывно связаны с Гродно, местах отдыха горожан и другую полезную информацию.

Ася КУНИЦКАЯ

Новая партия

В Гродно создается новая политическая партия, которая собирается защищать интересы среднего класса. Учредительный съезд намечен на 28 августа.

Инициатива создания партии принадлежит лидеру Профсоюза предпринимателей Беларуси, экспредседателю гродненской областной организации Объединенной гражданской партии Валерию Левоневскому. В интервью БелаПАН он заявил, что партия будет иметь экономическую направленность. Предполагается, что костяк организации составят белорусские предприниматели. Учредители также надеются, что в ряды новой партии вольется часть студенчества и белорусской интеллигенции.

По словам В.Левоневского, в течение ближайшего месяца должно пройти публичное обсуждение программных документов партии, которые будут вынесены на утверждение делегатов съезда.


Учредители объявили конкурс на лучшее название, флаг и символику новой партии. Победителя ожидает приз в размере 20 условных единиц.

Юрий ПОТЕМКИН

Газета Слонімская
6 — 12 ліпеня, 2000г. № 28 (161)

АМАЛЬ ФЕЛЬЕТОН

ДЗЕЦІ, ДЗЕ ВАС ПАДЗЕЦІ?


Фота Віталя ГІЛЯ

Мала нам нітратаў ды нуклідаў? Мала таго, што ў кожным капусным лісце сядзяць стронцый і цэзій? Дык яшчэ і дзетак Бог паслаў невядома якіх. Старыя людзі кажуць, што даўнейшыя чэрці былі больш лагодныя, чым цяперашнія дзеці. Ледзь толькі ад зямлі адрастуць, як хапаюцца за пляшку, лепяць да губы цыгарэту, крадуць і дэбашыраць. Яшчэ ў час застою адзін мудрэц заўважыў: "Дзеці — наша будучыня. Давайце разам падумаем, як з імі змагацца". Тады пара ўжо было нешта надумаць, а цяпер дык і з пары сышло.

Знакаміты Аркадзь Райкін у адной са сваіх інтэрмедый расказваў аб вопыце выхавання ў адной талковай сям'і: "Сидоров старший Сидорова младшего драл, как Сидорову козу". Метад, што і казаць, добры, але ж не ў кожнай сям'і яго скарыстаеш. Бывае, што ўсе спрыяльныя тэрміны прапушчаны, і гэтыя неслухі пачынаюць даваць бацькам адлуп. Таму, як казаў адзін разумны чалавек, дзіця трэба вучыць, калі яно ляжыць упоперак ложка. Як ляжа ўздоўж, то ўжо яно цябе будзе вучыць.

Але ж скажыце, людзі добрыя, адкуль яны бяруцца, гэтыя неслухі, гэтыя зялёныя п'яніцы і злодзеі? Некаторыя бацькоў паппракаюць у недастатковай увазе да сваіх нашчадкаў і гэтым самым бяруць вялікі грэх на душу. Ніхто з бацькоў не скажа свайму сыну ці дачцы:

— Пі, нябога, гарэлку пі, як будзеш мець час, схадзі ўкрадзі ў суседа кашалёк з грашыма.

Не кажуць, а яны ж, паршыўцы, робяць гэта: і п'юць і крадуць.

А як матам крыюць! Каб у нас гэтак вуліцы асфальтам пакрывалі, то нідзе ніводнай калдобінкі не было б.

Не, бацькоў вінаваціць нельга, хоць некаторыя скептыкі кажуць, што многія продкі самі п'юць, брыдкасловяць і не прамінуць тое, што дрэнна ляжыць. Ну дык і што? На тое яны і дарослыя. Вялікі жыццёвы вопыт, мудрасць, складаныя абставіны ў некаторай ступені дазваляюць бацькам рабіць гэта. Ды не так яны ўжо шмат п'юць. Калі якую пляшку ў дзень — то хіба гэта грэх? І брыдкасловяць рэдка. Лічы, усяго за кожным дзесятым словам. А малыя ж — за кожным трэцім!

Ды хіба параўнаеш мацюкі? Калі бацькі далей трохпавярховага не падняліся, то дзеці ўжо гнуць дванаццаціпавярховым. Так бы мовіць, вышэйшы пілатаж.

